

# Дадатковай адукацыяй ахоплены ўсе малышы

**Для задавальнення запытаў бацькоў, развіцця творчых здольнасцей дзяцей, іх інтэлекту і ўмацавання іх здароўя ў яслях-садзе № 3 Зэльвы працуе шмат гурткоў. Ахоп выхаванцаў дадатковай адукацыяй складае 100%.**



Гурткі ва ўстанове створаны на аснове самаакупнасці. Гэта інтэлектуальны гурток "Эрудыт", музычна-тэатральны "Усмешка", спартыўны "Чароўны мяч". Пастаянна дзейнічае мастацкі гурток "Вясёлы пэндзлік" Зэльвенскага раённага ЦПР.

Падчас заняткаў у гуртку "Эрудыт" педагог Марына Пятроўна Шлык выкарыстоўвае аб'яднаныя тэматыкай, сюжэтам гульнявыя комплексы, што развівае лагічнае мысленне, робіць працэс засваення навыкаў і ведаў эфектыўным і комплексным. Педагог шмат часу ўдзяляе падрыхтоўцы да заняткаў, для кожных — свой нагляднь матэрыял. Кіраўнік выкарыстоўвае такія формы работы з дзецьмі, як работа ў парах, індывідуальная і групавая.

Музычна-тэатральны гурток "Усмешка" з задавальненнем наведваюць выхаванцы старшай групы. Падчас заняткаў Святлана Аркадзьеўна Мінчук стварае кожнаму дзіцяці ўмовы для творчасці. Заняткі не ператвараюцца толькі ў развучванне музычнай казкі, педагог практыкуе тэатралізаваныя гульні-імправізацыі. У выніку дашкольнікі адкрываюць у сабе прыхаваныя таленты. Гуртκоўцы — пастаянныя ўдзельнікі конкурсу тэатральных калектываў "І гучала казка", дзе займаюць прызавыя месцы.

Спартыўны гурток "Чароўны мяч" наведваюць выхаванцы сярэдняй групы. Асноўныя задачы гуртка — фарміраванне жыццёва неабходных рухальных уменняў і навыкаў, мэтанакіраванае ўздзеянне на развіццё спрытнасці, хуткасці, сілы, а таксама выхаванне маральна-валявых якасцей у дашкольнікаў. Заняткі Ірына Леанідаўна Пузач праводзіць у сюжэтна-гульнявой форме. Як вынікае з назвы гуртка, усе заданні і практыкаванні выконваюцца з выкарыстаннем мяча.

Гурток "Вясёлы пэндзлік" наведваюць дзеці старшай групы. Усе заняткі ў ім носяць сюжэтны характар. За час наведвання гуртка выхаванцы пазнаёміліся з такімі тэхнікамі малявання, як метад тычка, маляванне васковай крэйдай, маляванне па сырой паперы, кляксаграфія, пячатка і інш. Юныя мастакі вельмі любяць імправізаваць, фантазіраваць, эксперыментаваць. Педагог Яўгенія Міхайлаўна Захарка ўмее настроіць дзяцей на выкананне будучай работы.

Асаблівую ўвагу кіраўнікі гурткоў удзяляюць развіццю творчых здольнасцей, асабістаму росту кожнага дзіцяці ў сваім відзе дзейнасці, навучанню тэхнікам і прыёмам, а таксама рэкламе свайго гуртка сярод бацькоў. Ужо стала традыцыяй напрыканцы кожнага навучальнага года праводзіць творчыя справаздачы кіраўнікоў і гуртκоўцаў для бацькоў.

Удзельнікі гурткоў — частыя пераможцы раённых выстаў і конкурсаў. Так, дзеці нашай установы сталі пераможцамі ў раённых конкурсах: на лепшага чытача сярод дзяцей дашкольнага ўзросту "Мая матуля — самая лепшая"; занялі ІІ месца ў музычным конкурсе ў намінацыях "Самы абаяльны выканаўца" і "За самае лірычнае выкананне" сярод выхаванцаў сярэдняга ўзросту; у конкурсе "Маленькі скульптар" занялі І месца ў намінацыі "Сюжэтная лепка" (з калектыўнай работай "Вясёлыя жыхары Поўначы").

**Таццяна ТРАЦЦЯК,
намеснік загадчыка па асноўнай дзейнасці ясляў-сада № 3 Зэльвы.**





# Дадатковай адукацыяй ахоплены ўсе малышы

**Для задавальнення запытаў бацькоў, развіцця творчых здольнасцей дзяцей, іх інтэлекту і ўмацавання іх здароўя ў яслях-садзе № 3 Зэльвы працуе шмат гурткоў. Ахоп выхаванцаў дадатковай адукацыяй складае 100%.**



Гурткі ва ўстанове створаны на аснове самаакупнасці. Гэта інтэлектуальны гурток "Эрудыт", музычна-тэатральны "Усмешка", спартыўны "Чароўны мяч". Пастаянна дзейнічае мастацкі гурток "Вясёлы пэндзлік" Зэльвенскага раённага ЦПР.

Падчас заняткаў у гуртку "Эрудыт" педагог Марына Пятроўна Шлык выкарыстоўвае аб'яднаныя тэматыкай, сюжэтам гульнявыя комплексы, што развівае лагічнае мысленне, робіць працэс засваення навыкаў і ведаў эфектыўным і комплексным. Педагог шмат часу ўдзяляе падрыхтоўцы да заняткаў, для кожных — свой нагляднны матэрыял. Кіраўнік выкарыстоўвае такія формы работы з дзецьмі, як работа ў парах, індывідуальная і групавая.

Музычна-тэатральны гурток "Усмешка" з задавальненнем наведваюць выхаванцы старшай групы. Падчас заняткаў Святлана Аркадзьеўна Мінчук стварае кожнаму дзіцяці ўмовы для творчасці. Заняткі не ператвараюцца толькі ў развучванне музычнай казкі, педагог практыкуе тэатралізаваныя гульні-імправізацыі. У выніку дашкольнікі адкрываюць у сабе прыхаваныя таленты. Гурткоўцы — пастаянныя ўдзельнікі конкурсу тэатральных калектываў "І гучала казка", дзе займаюць прызавыя месцы.

Спартыўны гурток "Чароўны мяч" наведваюць выхаванцы сярэдняй групы. Асноўныя задачы гуртка — фарміраванне жыццёва неабходных рухальных уменняў і навыкаў, мэтанакіраванае ўздзеянне на развіццё спрытнасці, хуткасці, сілы, а таксама выхаванне маральна-валявых якасцей у дашкольнікаў. Заняткі Ірына Леанідаўна Пузач праводзіць у сюжэтна-гульнявой форме. Як вынікае з назвы гуртка, усе заданні і практыкаванні выконваюцца з выкарыстаннем мяча.

Гурток "Вясёлы пэндзлік" наведваюць дзеці старшай групы. Усе заняткі ў ім носяць сюжэтны характар. За час наведвання гуртка выхаванцы пазнаёміліся з такімі тэхнікамі малявання, як метад тычка, маляванне васковай крэйдай, маляванне па сырой паперы, кляксаграфія, пячатка і інш. Юныя мастакі вельмі любяць імправізаваць, фантазіраваць, эксперыментаваць. Педагог Яўгенія Міхайлаўна Захарка ўмее настроіць дзяцей на выкананне будучай работы.

Асаблівую ўвагу кіраўнікі гурткоў удзяляюць развіццю творчых здольнасцей, асабістаму росту кожнага дзіцяці ў сваім відзе дзейнасці, навучанню тэхнікам і прыёмам, а таксама рэкламе свайго гуртка сярод бацькоў. Ужо стала традыцыяй напрыканцы кожнага навучальнага года праводзіць творчыя справаздачы кіраўнікоў і гуртоўцаў для бацькоў.

Удзельнікі гурткоў — частыя пераможцы раённых выстаў і конкурсаў. Так, дзеці нашай установы сталі пераможцамі ў раённых конкурсах: на лепшага чытача сярод дзяцей дашкольнага ўзросту "Мая матуля — самая лепшая"; занялі II месца ў музычным конкурсе ў намінацыях "Самы абаяльны выканаўца" і "За самае лірычнае выкананне" сярод выхаванцаў сярэдняга ўзросту; у конкурсе "Маленькі скульптар" занялі I месца ў намінацыі "Сюжэтная лепка" (з калектыўнай работай "Вясёлыя жыхары Поўначы").

**Таццяна ТРАЦЦЯК,
намеснік загадчыка па асноўнай дзейнасці яслейсада № 3 Зэльвы.**

